**ДУК Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці**
**і метадычнай работы**

## Хроніка
## культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за ліпень 2025 г.

У бібліятэках установы з **1 чэрвеня** пачаўся раённы бібліятэчны конкурс на лепшую пастаноўку работы з дзецьмі і падлеткамі ў канікулярны час у рамках сацыякультурнага праекта «Объединить, заинтересовать, увлечь», які працягваецца і ў ліпені.

**1.07.2025 г.**

У ЦРБ адбылася літаратурна-патрыятычная кампазіцыя «І гэта ўсё - мая краіна, мая родная Беларусь», прымеркаваная да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Гасцямі мерапрыемства сталі чытачы бібліятэкі. У выкананні гасцей прагучалі вершы аб вайне, Радзіме, роднай мове. Незабыўныя эмоцыі падарыла член Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік літаратурнага клуба «ПаэтыКа» Наталля Кандрашук, якая падзялілася з гледачамі сваёй творчасцю.

ЦРБ

**6.07.2025г.**

У рамках раённага конкурсу «Люблю мой край, старонку гэту» ў філіяле «Гарадзецкая сельская бібліятэка» прайшла краязнаўчая квэст-гульня «Мой родны край». Юныя наведвальнікі ўдзельнічалі ў шасці краязнаўчых станцыях, на якіх паказвалі свае веды аб гісторыі роднага аграгарадка, жывёльным і раслінным свеце, аб воінскім пахаванні аг. Гарадзец.

Філіял «Гарадзецкая сельская бібліятэка»

**9.07.2025 г.**

У ЦРБ прайшла гадзіна духоўнай асветы «Живет в веках любовь и верность», прымеркаваная да Дня памяці святых Пятра і Фяўронні. Вядучыя пазнаёмілі прысутных з гісторыяй свята, жыццём святых цудатворцаў, верных і вялебных мужа і жонкі Мурамскіх князёў Пятра і Фяўронні, здаўна шанаваных як захавальнікаў сям'і і шлюбу. Наведвальнікі мерапрыемства прынялі ўдзел у конкурсе загадак і прыказак аб сям'і. На працягу ўсяго мерапрыемства гучалі ўрыўкі з твораў айчыннай і сусветнай мастацкай літаратуры пра сям'ю. Гадзіна духоўнай асветы суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Любовью дорожить умейте».

ЦРБ

**18.07.2025 г.**

У ЦРБ была арганізавана музычна-літаратурная гасцёўня «Я слаўлю край, дзе нарадзіўся!», прымеркаваная да Дня горада Кобрына (20.07.) У музычна-літаратурнай гасцёўні знайшлі адлюстраванне гісторыя Кобрына, гераізм кобрынчан у гады Вялікай Айчыннай вайны і сённяшнія дасягненні горада. Сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, кіраўнік клуба «Паэтыка»

Наталля Кандрашук падзялілася з прысутнымі сваёй творчасцю, прысвечанай любімаму гораду. Музычную ноту мерапрыемству надалі песні ў выкананні вакальнай групы «Фантазия» і Наталлі Раманюк. Напрыканцы мерапрыемства жыхары горада пазнаёміліся з адкрытым праглядам краязнаўчых выданняў бібліятэкі пра Кобрын «Горад, у якім мы жывем: краязнаўчы калейдаскоп».

ЦРБ

**23.07.2025**

У рамках рэгіянальнай праграмы «Забота» ў філіяле «Дзіцячая бібліятэка» праведзена гадзіна інфармацыі «БезОпасные каникулы». Інспектар ІСН Кобрынскага РАУС Сяргей Андрэюк пазнаёміў юных удзельнікаў з асновамі бяспекі паводзін на дарогах. Хлопчыкі і дзяўчынкі ўспомнілі правілы дарожнага руху, разабралі небяспечныя сітуацыі, якія могуць узнікнуць пры катанні на ровары або роліках. Дзеці з цікавасцю адказвалі на пытанні віктарыны, накіраваных на замацаванне ведаў ПДР.

Філіял «Дзіцячая іблiятэка»

**23.07.2025 г.**

У рамках дэкады «Нацыянальнай культуры і беларускай гасціннасці» ў ЦРБ прайшла ўнфармацыйная гадзіна «Беларускія традыцыі: захоўваем і памнажаем». Наведвальнікі мерапрыемства здзейснілі захапляльнае падарожжа ў свет народнай культуры і творчасці беларускага народа, у якім пазнаёміліся з народнымі традыцыямі і абрадамі беларусаў, са святамі беларускага календара, з нацыянальнай кухняй, з традыцыйным народным беларускім адзеннем, у т. л. з кобрынскім строем жаночага касцюма.

ЦРБ

**24.07.2025 г.**

У інтэлектуальнай гульні «Што? Дзе? Калі?», якая праходзіла ў ЦРБ, прынялі ўдзел 5 каманд людзей сталага веку. Каманды знаўцаў спаборнічалі ў эрудыцыі, адказваючы на пытанні, якія тычацца розных абласцей ведаў. Пераможцы атрымалі пераходны кубак гульні «Што? Дзе? Калі?».

ЦРБ

**25.07.2025**

Чарговая вучоба кадраў бібліятэкараў адбылася ў форме круглага стала «Эффективная организация библиотечного обслуживания - ориентир на пользователя». У час правядзення мерапрыемства адбылася грунтоўная прафесійная размова па ўсім накірункам бібліятэчнай дзейнасці «Алгарытм дзейнасці сельскай бібліятэкі».

ЦРБ

Выканаўца
Галавейка Т. А,
3 85 81